настаўнік можа не толькі па біяграфіях, але і па змесце твораў. Для гэтага ў воблаку павінна змяшчацца інфармацыя пра галоўных герояў твора, месцы, дзе адбываецца дзеянне, нейкія адметныя дэталі. Таксама воблакі могуць змяшчаць у сабе інфармацыю пра аднаго канкрэтнага героя, калі ён падрабязна і ярка прапісаны аўтарам. Напрыклад, пасля вывучэння твора Якуба Коласа "На ростанях" можна стварыць воблакі на аснове вобразаў Андрэя Лабановіча, Ядвісі, Алеся Садовіча і іншых, бо іх падрабязнае апісанне змешчана ў тэксце твора.

Пры вывучэнні лірыкі настаўнік можа прапанаваць вучням стварыць воблака слоў з мастацкіх сродкаў, якія ўжывае аўтар у творы, а пасля прэзентаваць тое, што атрымалася, і паралельна тлумачыць ролю кожнага сродку мастацкай выразнасці.

На ўроках беларускай мовы "воблака слоў" можна прымяняць пры вывучэнні характарыстык розных часцін мовы. Напрыклад, спачатку настаўнік тлумачыць новую тэму пра назоўнік, разам з класам ствараецца воблака слоў, якое змяшчае асноўныя характарыстыкі, словы для гэтага могуць быць наступнымі: *самастойны, прадмет, хто, што, род, лік, склон, дзейнік, выказнік, дапаўненне*. Такое воблака ствараецца на кожную часціну мовы. Пасля гэтага настаўнік можа раздаць вучням воблакі, у якіх будзе не хапаць некаторых характарыстык, а вучні павінны будуць іх узнавіць, або, напрыклад, узгадаць, для якой часціны мовы ўласцівы наступныя характарыстыкі. Гэты метад не толькі дапаможа актывізаваць вучняў падчас стварэння воблакаў, але і ўпарадкуе інфармацыю, зробіць яе больш цікавай і даступнай для запамінання.

Дадзены метад таксама можна выкарыстоўваць для вывучэння слоўнікавых слоў па пэўнай тэме або для запамінання пэўных лінгвістычных тэрмінаў.

Такім чынам, можна прыйсці да высновы, што выкарыстанне такога прыёму, як "воблака слоў", дапамагае не толькі зрабіць урокі больш цікавымі для вучняў, але і актывізуе іх увагу, вучыць знаходзіць у тэксце галоўную інфармацыю і выкарыстоўваць яе, развівае творчае і крытычнае мысленне школьнікаў, дапамагае сістэматызаваць і запоўніць атрыманыя веды. Менавіта гэтыя фактары і з'яўляюцца асноўнымі пры выбары і распрацоўцы новых прыёмаў і форм работы на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

**Літаратура**

1 Научный журнал «Успехи современного естествознания» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://natural-sciences.ru/ru/article/view?id=33111. – Дата доступа: 20.04.2024.

2 Інтэрактыўная гісторыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://sites.google.com/site/interaktivnaaistoria/home/vizualizacya. – Дата доступу: 20.04.2024.

3 Инфоурок [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://infourok.ru/primenenie-priyomov-vizualizacii-na-urokah-russkogo-yazyka-i-literatury-6061517.html. – Дата доступа: 20.04.2024.

**УДК 821.161.3-14*Н.Мацяш**

***А. М. Фелькіна***

## "КАХАЮ. І ЧАКАЮ": МАСТАЦКАЯ АДМЕТНАСЦЬ ІНТЫМНАЙ ЛІРЫКІ НІНЫ МАЦЯШ

*У артыкуле прааналізавана інтымная лірыка Н. Мацяш. Сцвярджаецца, што біяграфія паэткі моцна паўплывала на яе творчасць. Вершы Н. Мацяш выяўляюць душэўны і фізічны стан аўтаркі ў розныя перыяды творчасці, яе стаўленне да кахання і каханага, драму асабістага жыцця. Я-гераіня Н. Мацяш перажывае розныя адценні пачуцця кахання і пражывае розныя яго этапы.*

Літаратуразнаўца Ала Сямёнава назвала Ніну Мацяш “каралевай айчыннай паэзіі і паэткай высокага еўрапейскага кшталту, якая адчувала жыццё на высокіх хвалях і даказала, што і па-беларуску можна ўзнёсла пісаць” [1, с. 78]. І гэта сапраўды так… Ніна Мацяш – лірычная паэтка, якой было дадзена словам кранаць сэрцы чытачоў, узрушваць людскія думкі.

Н. Мацяш, асэнсоўваючы праблему матэрыяльнага і духоўнага ў грамадстве, ролю мастацтва ў вырашэнні гэтай праблемы, у адным са сваіх інтэрв’ю зазначыла: “Я не ведаю ніводнага, колішняга ці сучаснага, грамадства, у якім бы духоўнае пераможна панавала над матэрыяльным. Паўсюль «душа яшчэ з дзерава не злезла»” [2, с. 3].

Чытаючы інтымныя вершы Ніны Мацяш, адразу згадваюцца радкі з верша Яўгеніі Янішчыц: “*Пачынаецца ўсё з любві, а інакш і жыць немагчыма*” [3, с. 17] (“Ты пакліч мяне. Пазаві…”). Лірычны свет Ніны Мацяш, як і Яўгеніі Янішчыц, напоўнены святлом кахання і любові. І ў гэтым бачыцца арганічнае выяўленне сутнасці жанчыны, для якой самая высокая мерка – каханне. Наогул, гэтае пачуццё – цэнтральная тэма ў творчасці многіх паэтак.

“Кахаю. І чакаю” – гэтымі словамі з верша “Запозненаю дзікаю ажынай...” можна вызначыць эмацыянальна-псіхалагічную дамінанту інтымнага свету Ніны Мацяш:

“*Чакай. Кахай*”.
*Кахаю.*
*І чакаю.*
*На самаце.*
*Сярод людзей.*
*Цяпер*
*Само паветра дасканала знае,*
*Як ім балюча дыхаць*
*Без цябе* [4, с. 18].

Каханне лірычнай гераіні нешчаслівае, але нельга сказаць, што неўзаемнае (“*Запозненаю дзікаю ажынай / Узаемнасць наша дзёрзка расцвіла*” [4, с. 18]). Драма кахання ў тым, што яно не можа працягвацца бясконца, хаця сярод людзей шмат летуценнікаў, якія мараць аб вечным каханні. Лірычная ж гераіня Н. Мацяш не з іх кагорты. Яна, абцяжараная невылечнай хваробай, добра разумее, што лепш абарваць усе сувязі з каханым чалавекам, бо з часам гэта будзе зрабіць больш складана, што будучага ў адносінах няма: “*Мы ж разумелі / Што блакітнай грывай / Праменны далягляд / Не нас / Заве*” [4, с. 18]. І тым не менш, нейкі промень надзеі ўсё ж застаецца і пры такім раскладзе, пры такім выбары лірычнай гераіні. Каханне заўсёды спараджае надзею, пра што сведчаць прыведзеныя радкі з верша.

Лірыка кахання паэтэсы пабудавана цалкам на ўласных самотных перажываннях. Паміж лірычнай гераіняй і Нінай Мацяш можна паставіць калі не знак роўнасці, то знак блізкага падабенства. Чалавек, які сам не пражываў складаныя моманты ў сваім жыцці, не можа перадаць усю глыбіню пачуццяў і перажыванняў. Закаханая лірычная гераіня верша “Незалежнасць” не забываецца на сваю годнасць, самапавагу:

*Калі і чым насцярожыла – забудзь.*
*На незалежнасць я не пасягаю.*
*Мне б толькі твае вочы прысягалі,*
*А будзь такі, як ёсць.*
*Ты толькі будзь!* [4, с. 45]

Яна не прэтэндуе на свабоду каханага, аднак інтуітыўна, па-жаноцку дзёрзка ўпэўнена ў сваім уплыве на яго, у іх эмацыянальнай блізкасці:

*Табе здаецца, вольны ты казак,*
*Калі ў пачуццях гэткі асцярожны.*
*А варта мне адно слаўцо сказаць –*
*І ўздрыгнеш ты шчаслівы і трывожна* [4, с. 45].

Каханне дае чалавеку надзею, сілу, веру ў лепшае. Нават у складаныя моманты жыцця, калі здаецца, што праблемы бясконцыя, важна помніць, што ёсць у жыцці светлыя моманты, якія дапамагаюць хоць хвілінку пастаяць "*на ўскрайку шчасця*":

*Кажы ласкавыя мне словы,*
*Дары пяшчоту мне сваю,*
*І прызабудуся вяснова,*
*На ўскрайку шчасця пастаю...*
*Хай хоць на момант ашукаю*
*І немагчымасць, і бяду,*
*Так хараша і нечаканна,*
*Вакол мезенца абвяду!* [4, с. 45]

Ніна Мацяш усё жыццё была мужнай, дужай і адначасова пяшчотнай, жаноцкай. Вершы паэткі – дыялог з каханым чалавекам, у якім лірычная гераіня спрабуе адшукаць адказы на "вечныя" пытанні, але не заўсёды іх знаходзіць а можа ёй важна толькі быць побач з каханым чалавекам:

*Пытаешся, чаго маўчу.*
*Я не хачу*
*Парушыць гэтую магчымасць –*
*Паслухаць, што там, за вачыма,*
*За небам позірку твайго* [5, с. 67].

Я-гераіня імкнецца зазірнуць у будучыню і разам з тым не хоча правакаваць яе, яна не настолькі непрадбачлівая, каб не пралічваць вынікі ўчынкаў і пачуццяў, але часам хоча запаволіць шчаслівыя моманты жыцця, пражыць іх не спяшаючыся і не думаючы пра наступствы:

*Загавару – і не пачую,*
*Што*
*Птушка часу нам вяшчуе* [5, с. 67].

Як вядома, прырода ў вершах можа адыгрываць ключавую ролю і паказваць настрой лірычнага героя. Не выключэнне ў гэтым плане і верш Н. Мацяш "Адна…". Лірычная гераіня параўноўвае сябе з адзінокай сасной, якой наканавана дажываць свой век у самоце:

*Адна...*
*Яна яшчэ здалёк відна:*
*На выгарбку, вятрам усім адкрытым,*
*Стаіць сухая, чорная сасна,*
*Як даўкі сімвал тлену і нябыту* [4, с. 50].

Жыццё настолькі спустошыла гэтае дрэва, "*Што сіл няма ўжо ні зазелянець / Хоць голькаю адной / Ні ўпасці*" [4, с. 50].

У вершах Н. Мацяш ёсць месца не толькі драматызму, але і надзеі на шчаслівае, самадастатковае жыццё. Я-гераіня спрабуе даказаць, у першую чаргу сабе, што жыццё без каханага чалавека таксама можа быць шчаслівым. Упэўненая, што навучылася жыць адна, яна ўжо не марнуе час на бессэнсоўныя мары і надзеі:

*Бясплённа дзень не праміне,*
*На мары не патрачу.*
*Смяюся, калі смешна мне,*
*А плачацца – не плачу* [4, с. 21].

Але ці задавальняе такое жыццё лірычную гераіню?! Яна спрабуе жыць па-новаму, без мар і спадзяванняў. Так, у яе больш няма трывожных думак, але разам з перажываннямі, эмоцыямі зніклі і яркія, шчаслівыя моманты ў жыцці, пра што з самаіроніяй зазначае я-гераіня:

*Так, мне ўсё лепей без цябе.*
*Жніво паспела ў часе.*
*Ні тлуму, ні трывог цяпер.*
*...І ні хвіліны шчасця* [4, с. 21].

Каханне часам мацнейшае за жыццёвыя выпрабаванні. Але здараюцца праблемы, ад якіх не можаш збегчы, схавацца. Выйсце з гэтага толькі адно – прыняць іх і навучыцца з імі жыць, зберагаючы пачуццё кахання і вобраз каханага ў памяці:

*Я цябе ніколі не забуду*
*Не таму, што шчэ сустрэчы будуць*
*Што адзін пагляд і слоўка ў стане*
*Замасціць бяздонне развітання* [6, с. 47].

Пра ўвасабленне пачуцця кахання ў паэзіі Ніны Мацяш слушна і глыбока выказаўся У. Калеснік: “У прынцыпе, гэта паэтычная філасофія кахання як загадкавага стану, дзе вітальная сіла скрыжоўваецца з сакральнай запаветнасцю. Мэта яе – азоранасць сэнсам тварэння жыцця” [7, с. 187].

Такім чынам, уся творчасць Ніны Мацяш – гэта імкненне пераадолець адзіноту, той драматызм жыцця, які быў наканаваны ёй лёсам. Ніна Мацяш – моцная, стойкая жанчына, але адначасова летуценная і кволая. У інтымнай лірыцы яна выявіла розныя стадыі пачуцця кахання: гэта поўная разгубленасць перад такім вялікім пачуццём, як каханне, і свядомая адмова ад яго, і разам з тым бясконцая надзея на шчаслівае будучае. Але ў абодвух выпадках каханне – светлае пачуццё, якое можа зрабіць немагчымае: адрадзіць свет, наблізіць чалавека да нябёсаў, навучыць марыць і адчуць сябе хоць на хвілінку самым шчаслівым чалавекам.

## Літаратура


1 Калеснік, У. Усё чалавечае: літ. партрэты, арт., нарысы / У. Калеснік. – Мінск : Народная асвета, 1993. – 379 с.

2 Мацяш, Н. Мая тэма – чалавек: [гутарка з беларус. паэткай Н. Мацяш / Запісаў М. Ваўранюк] / Н. Мацяш // Ніва. – 1992. – Май (№ 20). – С. 3.

3 Янішчыц, Я. Пачынаецца ўсё з любві… : вершы, паэмы / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 339 с.

4 Мацяш, Н. Душою з небам гаварыць: выбранае. Лірыка / Н. Мацяш. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 234 с.

5 Мацяш, Н. Паміж усмешкай і слязой: вершы і паэмы (1962–1992) / Н. Мацяш. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 301 с.

6 Мацяш, Н. Поўны келіх : лірыка / Н. Мацяш. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 63 с.

7 Калеснік, У. Дар гармоніі. Прадмова да кнігі / У. Калеснік // Н. Мацяш. Паміж усмешкай і слязой. – Мінск : Маст. літ., 1993. – С. 3–18.



**УДК 811.161.1’42:821.161.1-84:27-18**



***Е. А. Черношей***


# НОМИНАЦИИ СУБЪЕКТА В АФОРИЗМАХ РУССКИХ ПИСАТЕЛЕЙ О ЧЕЛОВЕКЕ


*В статье анализируются типы и способы выражения компонентов с субъектным значением, входящих в состав афоризмов русских писателей о человеке. Для анализа выбраны афоризмы, имеющие структуру простого предложения. Характеризуются субстантивный и местоименный, прямой и косвенный способы выражения субъекта. Приводится тематическая классификация компонентов с субъектным значением.*


Афоризмы как уникальные вербальные единицы распространены во многих стилях и жанрах литературы: художественной литературе и фольклоре, религиозных